ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
14
ЛІСТАПАДА
№ 27(1691)

А Ў ВАС?

А Ў НАС!

ПРЭЧ ПАЛІТЫКУ!

Нялёгкая гэта справа — прэзентацыя газеты, ды яшчэ такой, як «Наша ніва». І ўсё ж, на гэта адважыўся ХБС.

— Зараз нецікава займацца палітыкай,— адзначыў ва ўступнай прамове паэт і празаік Адам Глобус.— Я хачу займацца мастацтвам, хачу, каб, нарэшце, загаварылі пра культуру. Мэта адроджанай газеты «Наша ніва» — знішчыць палітыку.

Напэўна, газеце гэта пад сілу, бо выдаецца яна за прыватныя грошы і залежыць толькі ад сваіх чытачоў, іх падтрымкі.

Як высветлілася, рэдакцыя газеты мае свае фантастычныя праекты, з якімі прысутных пазнаёміў паэт і эсэіст Ігар Бабкоў.

Некалькі разоў на сцэну выходзіла Кася Камоцкая, якая выконвала песні на вершы Таццяны Сапач, Ігара Бабкова, Адама Глобуса. Музычныя выступленні працягвалі Алесь Камоцкі, Андрэй Мельнікаў.

Не застаўся ў баку і «Хаўрус». У другой частцы святочнага вечара выступілі менш вядомыя пакуль што выканаўцы ўласных песень — студэнты БДУ Святлана Мядзведзева, Кастусь Елісееў, Вольга Акуліч, Валерый Пазняк-евіч.

АД КАСТРЫЧНІКА — ДА КАСТРЫЧНІКА

Рэвалюцыі не вяртаюцца

На святкаванне 74-га дня нараджэння Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Мінск знянацку трапілі чырвонаармеец, матрос і рабочы, якія ў далёкім 17-м бралі штурмам Зімні.

А свята, як вы ўжо здагадваецеся, зусім не выпадкова не адбылося.

Бо ўсе неверагодна стаміліся, стоячы ў чэргах за маслам, яйкамі, малаком і нават хлебам. Былы энтузіязм захавалі толькі адданыя ленінцы-камуністы. Звычайныя ж людзі ажыццяўлялі «кухонную» палітыку і радаваліся магчымасці папоўніць засекі перад грознай атакай рыначных цэн.

Расчараваліся асілкі. Хіба за гэта змагаліся? «Памылка, — гавораць, — нейкая адбылася. Будзем пераварот ладзіць. Уся ўлада — бальшавікам!»

І няўцям ім, што самі яны — проста персанажы для «святочнай» перадачы, якую прыдумалі супрацоўнікі рэдакцыі праграм для дзяцей і юнацтва Беларускага тэлебачання.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

ДОШКА АБ'ЯЎ

Актуальныя праблемы выкладання гісторыі ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах будуць абмеркаваны на навукова-метадычным семінары, які адбудзецца 21—22 лістапада на базе інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў гуманітарных дысцыплін пры БДУ імя У. І. Леніна.

У праграме семінара наступныя пытанні: роля гістарычных ведаў у падрыхтоўцы спецыяліста, крызіс гістарычнай навукі, новыя падыходы да вывучэння гісторыі, актуальныя праблемы выкладання гісторыі Беларусі, замежны вопыт выкладання гісторыі ў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школе.

У САЮЗ ПРАЗ ШКОЛУ

2 лістапада ў СШ № 119 адбыўся арганізацыйны сход новага маладзёжнага Саюза «Альтэрнатыва», месца для якога прадаставіла зноў жа школа № 119. Цэнтр скіраваны на аб'яднанне творчай моладзі г. Мінска, на правядзенне выстаў і канцэртаў, выпуск друкаванага выдання, арганізацыю вечароў — адным словам, на пошук скарыстання талентаў моладзі. Што атрымаецца на практыцы — пакажа час.

ПА САКРЭТУ УНІВЕРСІТЭТУ

КАМІТЭТ ПРАВАЛІЎСЯ

У 1990 годзе быў створаны камітэт з шыкоўнай назвай «Па праблемах энерга-інфармацыйнага абмену ў прыродзе пры Беларускім кіраўніцтве Саюза навуковых і інжынерных таварыстваў СССР». Як паведаміў нам былы яго старшыня, загадчык кафедры радыёфізікі **Аляксандр Міхайлавіч ШЫРОКАЎ**, камітэт «загадаў доўга жыць». Пад дахам былога камітэта было сабрана зашмат секцый, напрамкі даследаванняў якіх суадносіліся прыкладна такім чынам, як бузіна і дзядзька ў Кіеве. Там даследавалі адначасова і НЛА, і народную медыцыну, і яснабачанне, і ў той жа час энергію вакууму, і генетычныя структуры. Агульным было толькі тое, што за ўсімі феноменамі, на думку даследчыкаў, стаялі энерга-інфармацыйныя абмены. Пасля развалу актыўна дзейнічаць працягваюць толькі асобныя секцыі.

ПАСЛЯ ГАЛАДОЎКІ

ПАДТРЫМАЕМ?

–ЗАБАСТОЎКА

Зноў у лістападзе, быццам адзначаючы гадавіну сваёй леташняй галадоўкі, старшы выкладчык кафедры агульнай хіміі Канстанцін Мікалаевіч ЛАПКО правёў забастоўку. Аднадзённую, папераджальную, палітычную.

Метад барацьбы змяніўся, але нагода засталася ранейшай — крытычны стан нашай вышэйшай адукацыі. На думку неўтаймаванага выкладчыка, гэта становішча не толькі не палепшылася, але стала яшчэ горшым за год.

Перш чым правесці забастоўку Канстанцін Мікалаевіч даслаў адкрыты ліст дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Адным з самых небяспечных сімптомаў сённяшняга дня аўтар ліста лічыць безудзельнасць народа да крытычнага стану ў рэспубліцы. Прапановы, з якімі ён звяртаецца да дэпутатаў, датычацца перш за ўсё палітыкі.

Ён лічыць неабходным распусціць нефармальную партыю КПСС-КПБ, а таксама прыпыніць дэпутацкія паўнамоцтвы камуністаў у Саветах усіх узроўняў. «Калі Вярхоўнаму Савету не хопіць розумення і рашучасці прыпыніць дэпутацтва камуністаў,— гаворыцца далей у лісце,— гэтаму саставу Вярхоўнага Савета нельга давяраць прыняцце адказных рашэнняў. У гэтым выпадку неабходны самароспуск Вярхоўнага Савета з перадачай заканадаўчай улады часовай структуры...»

Такой жа надзённай неабходнасцю К. Лапко лічыць адстаўку ўрада і фарміраванне новага часовага кааліцыйнага ўрада.

У мэтах ратацыі кіруючага саставу ўсіх узроўняў трэба, як мяркуе аўтар ліста, прыняць пастанову, якая прадугледзіць немагчымасць займаць адміністрацыйныя пасады асобамі, узрост якіх больш чым 60 гадоў, а таксама недапушчальнасць сумяшчэння дзвюх адміністрацыйных пасад на тэрмін, даўжэйшы чым 2 месяцы, і знаходжанне на адной выбарнай пасадзе больш чым два разы запар.

Наступная прапанова, выказаная ў адкрытым лісце да дэпутатаў,— тэрміновая выплата разавай кампенсацыі памерам не менш чым 300 рублёў усім, хто атрымлівае заробак ці пенсію, ніжэйшыя за 500 рублёў.

Як і год назад, Канстанцін Лапко выказвае патрабаванні, накіраваныя на змены ва ўмовах працы выкладчыкаў, асістэнтаў, супрацоўнікаў ВНУ. Прапануецца павялічыць іх зарплату ў два разы з 1 лістапада бягучага года, а з 1 студзеня будучага года — павялічыць у два разы ў параўнанні з сярэдняй заработнай платай у прамысловасці.

11 лістапада старшы выкладчык кафедры агульнай хіміі К. М. Лапко правёў палітычную забастоўку — бо патрабаванні, змешчаныя ў яго адкрытым лісце да дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, не былі выкананы.

ТРАДЫЦЫІ

НЕ ТОЛЬКІ СТАЛІН ВІНАВАТЫ

Гадзіну перад жоўтым будынкам Камітэта дзяржаўнай бяспекі працягваўся другога лістапада мітынг-рэквіем, прысвечаны «Дзядам». На прыступках перад галоўным уваходам людзі трымалі харугву з эмблемай «Мартыралога Беларусі», які выступіў арганізатарам. Пры дапамозе дынамікаў добра было чуваць выступленні былых вязняў ГУЛАГа.

Упрыгожвалі людскі натоўп не толькі нацыянальныя сцягі, але і плакаты як з агульначалавечымі заклікамі: «Шануючы продкаў, становімся людзьмі!», так і з тыпова палітычнымі патрабаваннямі: «Распустить КГБ и национализировать имущество!»

Акцыя насіла палітычны характар. У прамове Васіля Хомчанкі прагучала думка, што ў гібелі дзесяткаў мільёнаў чалавек вінаваты не толькі Ленін і Сталін, але ж і Маркс. Бо Маркс заклаў тэорыю несправядлівага грамадства, а Ленін і Сталін толькі практычна ажыццявілі яго мары. Георгій Колас прапанаваў спыніць дзейнасць дэпутатаў-камуністаў у Вярхоўным Савеце краіны. У выступленні Зянона Пазняка прагучала трывога адносна эканамічнага і культурнага становішча Беларусі на цяперашні час.

Пад жалобную музыку быў устаноўлены драйляны помнік ахвярам рэпрэсій перад домам на скрыжаванні вуліцы Урыцкага і Ленінскага праспекта, дзе ў трыццатыя гады знаходзіўся астрог НКУС. Удзельнікі свята ўсклалі кветкі і памянулі забітых каля помніка ахвярам у парку Чалюскінцаў. Далейшы іх шлях ляжаў на Курапаты...

Ягор КОНЕЎ,
студэнт факультэта журналістыкі.

ЯК ВЫЖЫЦЬ?

Спецпайкі для студэнтаў

Некаторыя з вас пасміхаюцца? Але і сапраўды для таго, каб атрымаць карткі на пакупку харчовых тавараў ва універсітэцкім стале заказаў, студэнту дастаткова завесці ўласную сям'ю. Іншым катэгорыям студэнтаў прафком БДУ ільгот пакуль не абяцае. Для тых, хто падазрае, што ў спецпайках асаблівыя далікатэсы, адзначым: як у звычайным магазіне. Дзякуючы такой паслузе, абедзенны стол сямейнага студэнта нічым не адрозніваецца ад прафесарскага, ды і ў агульнай чарзе яны стаяць нароўні.

Наогул, старшыня прафсаюзнага камітэта студэнтаў БДУ **Адам Данілавіч КІШКЕВІЧ** не лічыць стол заказаў нейкай ільготай для студэнтаў. На яго ж думку, студэнты маюць столькі вольнага часу, што без клапот могуць стаць у хвост любой чаргі звычайнага магазіна.

ВЫ ЧУЛІ?

КУБАК,

адзінае, што спатрэбіцца вам пры наведванні пасяджэнняў Клуба самадзейнай песні беларускай

6 лістапада адбылося пасяджэнне Клуба самадзейнай песні беларускай. Як адзначана ў жартоўным па сваёй форме статуце КСП(б), сябрам яго можа лічыцца кожны, хто прыйдзе на пасяджэнне клуба і прынясе з сабой кубак для гарачых напіткаў (разумей — гарбаты). Узначальвае КСП рада — шэф-савет, які складаецца з шасці чалавек, але колькасць іх можа павялічвацца ў залежнасці ад патрэб. Перавыбары кіраўніцтва могуць праводзіцца па першаму ж патрабаванню сяброў клуба.

Шэф-аматар клуба Вольга Акуліч сказала мне, што галоўная мэта КСП(б) — сабраць аднадумцаў, усіх бардаў і аматараў беларускай песні, стварыць месца, дзе людзі маглі б збірацца штодзень. Акрамя пасяджэнняў, КСП(б) плануе ладзіць канцэрты ў школах і ВНУ па запрашэннях, праводзіць фестывалі беларускай бардаўскай песні. Студэнты, як вядома, з'яўляюцца самай спяваючай часткай грамадства, але ўзроставых абмежаванняў для тых, хто жадае стаць сябрам клуба, не існуе. КСП(б) запрашае да сябе ўсіх.

Што ж, пакуль можна вітаць стваральнікаў клуба з добрым пачаткам, а які ў яго будзе далейшы лёс — пабачым.

Ягор КОНЕЎ,
студэнт факультэта
журналістыкі.

АДЗІН З НАС

«ДАЙЦЕ КРОПКУ АПОРЫ...»

Сучаснасць складаюць людзі. Мой субяседнік — Алесь ШАВЕЛЬ, абаяльны старшыня адначасова дзвюх маладзёжных арганізацый, якія абралі за мэту адраджэнне Беларусі. Гэта не перашкаджае яму вучыцца на чацвёртым курсе гістфака, пісаць курсавую на тэму паўстання 1830-31 гг., маляваць сярэднявечча ў латах і макеты будучых газет, а наогул — патроху заваёўваць жыццё. Алесь не з тых, хто жыве па волі хваль. Адзін з двух яго дэвізаў у перакладзе з лацінскай гучыць так: «Кропля дзяўбе камень». Сцвярджае, што не збіраўся займацца палітыкай. Але адчуў: многія падзеі адбываюцца не так, як трэба. Таму ўзяўся адначасова за палітыку і культуру, бо лічыць, што для абуджэння беларусаў перш за ўсё трэба ўзварухнуць нацыянальны гонар, гістарычную свядомасць. Таму Алесь пачаў ствараць сваю арганізацыю. Палітыка, на яго думку,— гэта мастацтва.

— Алесь, з чаго пачаўся твой шлях у палітыку?

— Архімед казаў: «Дайце мне кропку апоры, і я перавярну свет». Ёсць дзве рэчы, на якія можна абаперціся: улада і грошы. Арганізацыя, якую мы ўтварылі ў 1990 годзе — «Чырвоны Жонд»,— меркавалася як міні-дзяржава са сваёй структурай улады, абавязкамі, скарбніцай. Калі нельга перайначыць усё грамадства, чаму б не паспрабаваць зрабіць гэта ў міні-форме?

— Што паспелі?

— Скарбаў яшчэ не нажылі, субсідый няма, а справа патрабуе невялікага пачатковага капіталу. Лепш з уладай. Хутка нам выдадуць пасведчанне аб рэгістрацыі. Мы ўваходзім у прэзідыум Камітэта маладзёжных арганізацый, таму можам уплываць на маладзёжную палітыку.

— Калі ёсць «Жонд», чаму ты заняўся «Хаўрусам»?

— Выпадкова. 10 кастрычніка праводзілася пасяджэнне камісіі Вярхоўнага Савета па справе беларусізацыі універсітэта, сустракаліся члены камісіі і студэнты, прадстаўнікі ад факультэтаў. Я ўбачыў, што ўсе гавораць добра, але без вынікаў, бо разрознена. Таму прапанаваў аб'яднацца ў арганізацыю.

— Чым будзе займацца «Хаўрус беларускамоўных студэнтаў»?

— Дапамагаць беларусізацыі універсітэта.

Мэты «Хаўруса» супадаюць з мэтамі «Жонда», але першы існуе дзеля універсітэта, а другі пашыраецца на ўсё грамадства.

Рада «Хаўруса» складаецца з прадстаўнікоў ад кожнага факультэта, таму мы зможам калькуліраваць дадзеныя і выносіць на абмеркаванне рэктаратам. Таксама будзем прапагандаваць гісторыю і культуру праз друк.

Ёсць прапанова наладзіць сувязь з іншымі ВНУ. Можна таксама праводзіць пачарговую навуковую канферэнцыю спачатку ў БДУ, потым у Львоўскім, Віленскім універсітэтах.

Галоўнае, чым мы валодаем, падтрымка рэктарата і Вярхоўнага Савета, інакш справа не мела б сэнсу.

— Як ты ўяўляеш сабе адраджэнне?

— Цывілізацыя кожнай эпохі мае нейкія межы. Паступова яна знікае, і аднавіць яе немагчыма. Паглядзі, ад Вялікага Княства Літоўскага мала што засталося. Таму на рэштках захаванага ўтвараецца новая цывілізацыя.

Зараз беларускае грамадства можна падзяліць на эліту, якая захавала лепшае, што засталося з тых часоў, палітызаванае асяроддзе з яго месцячковым патрыятызмам і абыякавую да культуры і палітыкі большасць. Тое ж назіраецца сярод студэнтаў. Але ў моладзі — будучыня. Таму трэба працаваць, варушыцца, шукаць новых людзей.

Нацыянальная свядомасць павінна будавацца на агульначалавечых каштоўнасцях — усё на тых жа біблейскіх запаветах. А таксама на талерантнасці — шыкоўнай рысе характару, уласцівай беларусам.

— Які перыяд у гісторыі Беларусі цябе больш цікавіць?

— Сярэднявечча, XVI стагоддзе. Уражвае Леў Сапега. Ён падзяляў погляды гуманістаў-памяркоўцаў Гусоўскага, Сымона Буднага, якія лічылі, што дзяржава засноўваецца на сацыяльнай няроўнасці, што адпавядае прыродзе, і роўнасці ўсіх перад законам. Да гэтага імкнуся і я.

— Ты адчуваеш повязь іх поглядаў з нашым часам?

— Безумоўна. Душа не знікае.

— Ты кажаш, што адчуваеш сябе па-за часам з яго мітуснёй. Ты прыхільнік усходняй філасофіі?

— Як адказаць... Я — ідэаліст. Веру, што душа існуе па-за целам, што чалавечае жыццё — гэта калыска, у якой выхоўваецца душа. Дзесьці за мяжой 25—30 год чалавек або ламаецца і дэградуе, або выходзіць на больш высокую прыступку. Таму сэнс жыцця чалавека — развіццё яго душы, індывідуальнасці, розуму. Нацыянальная культура — толькі адзін са сродкаў такога развіцця. Пачуццё меры, такту, густу стварае гарманічнага чалавека — падмурак, каб расці далей. Сусвет і самаўдасканаленне бясконцыя.

Н. ЖУК.

ПРАДАЕЦЦА МАЛАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТ

ВУЧЫЦЦА, ВУЧЫЦЦА І... НАВОШТА?

З размовы ў дэканаце механіка-матэматычнага факультэта:

— Складаней у нас стала жыць.

— Не. Стала значна прасцей...

Спачатку мне здавалася, што першая думка больш верагодная, потым — другая. Прайшоў час, і я зразумела, што гэта нельга вызначыць так адразу, беспамылкова: усё спрасцілася да вялікай складанасці.

Пасля атрымання універсітэцкага дыплома многія могуць прасачыць сумную, але даволі простую перспектыву: пойдзеш працаваць, куды хочаш. Але, здараецца, куды мяркуеш пайсці ты, пойдзе і твой сябар. Прадпрыемства ж яшчэ паглядзіць, чаго вы вартыя. І... адмовіць абодвум.

Цяжка ўявіць, а галоўнае — адчуць сэрцам, што, ТАМ — гэта так натуральна і нармальна, як і тое, што самыя шчаслівыя і непрыстасаваныя ў свеце — нашы маладыя спецыялісты. Ці патрэбны яны зараз каму?

Разгублена разводзіць рукамі Акадэмія навук: яе чакае вялікае скарачэнне, да 30 працэнтаў. Няма чым плаціць зарплату супрацоўнікам.

І такое кволае становішча амаль усюды: ніхто не адважыцца гарантаваць нейкую стабільнасць. Мы так збяднелі, што наўрад ці хопіць зараз кожнаму пакутніку нават па саломцы, каб трымацца, як кажуць, на плаву.

Дзе бераг і куды рухацца, ніхто дакладна не ведае. Вядома, што ўперад. Але калі нам завязалі вочы, перакруцілі некалькі разоў вакол ідэі, то ў напрамках няцяжка заблытацца.

Да нядаўняга часу пэўныя факультэты заключалі з прадпрыемствамі дагаворы. Калі звычайны студэнт атрымліваў стыпендыю 40 рублёў, то студэнт па дагавору, які павінен быў пасля заканчэння універсітэта працаваць на гэтым прадпрыемстве, — 68 рублёў. Так было, напрыклад, з «Інтэгралам». Каля 40 тысяч чалавек працуе на ім. Заключалі дагаворы адразу некалькі факультэтаў: хімічны, радыёфізікі і электронікі, фізічны, прыкладной матэматыкі, механіка-матэматычны. Падтрымліваліся вельмі цесныя сувязі на працягу некалькіх гадоў.

— кіраўнікі асноўных падраздзяленняў «Інтэграла» — выпускнікі нашага універсітэта,— гэта словы Івана Пятровіча Казлова, намесніка дэкана фізічнага факультэта, дацэнта кафедры фізікі паўправаднікоў.— Амаль усё кіраўніцтва Брэстскага філіяла гэтага прадпрыемства — выпускнікі нашага факультэта. Дарэчы, дырэктар, Міхаіл Уладзіміравіч Урбан, таксама з фізічнага факультэта. Так што, з аднаго боку, мы адчуваем сябе на ўзроўні.

Са 178 выпускнікоў фізічнага факультэта не знайшлі месца працы ў гэтым годзе толькі 12 чалавек. Размеркаваннем студэнтаў займаўся факультэт. Вельмі карпатліва і адказна пісаць на розныя прадпрыемствы лісты і прапаноўваць сваіх спецыялістаў.

Што ж адбылося пасля красавіцкага павышэння цэн? Прадпрыемствы павінны былі, як і ўсе, лічыць грошы...

Дамовіліся. Апрача стыпендыі ў 60 рублёў, як і для ўсіх студэнтаў, студэнт па дагавору атрымліваў 60 рублёў кампенсацыі, але ўжо не з універсітэцкага, а з кашалька «Інтэграла». Увогуле — 120 рублёў. І ўсе — 120 рублёў. Ніякай розніцы.

Дэкан механіка-матэматычнага факультэта **Леанід Платонавіч ПРЫМАЧУК:**

— У гэтым годзе мы не заключылі ніводнага дагавору. А навошта? Прадпрыемства пералічвае грошы, але да студэнта яны ўсё роўна не даходзяць. Студэнту, які атрымлівае гэтыя 60 рублёў ад прадпрыемства, наш універсітэт вырашыў не плаціць кампенсацыю.

Мінфін усё роўна дае грошы на кампенсацыю ўсім студэнтам. Вось і атрымалася, што гэтыя «лішнія» грошы былі пушчаны на даплату (30 рублёў) студэнтам да стыпендыі, якую ўсе атрымлівалі некалькі месяцаў.

Пакуль што ніхто нічога сур'ёзнага прадпрымаць не жадае. Усе чакаюць новага года — новага павышэння цэн. (Напэўна, і віншаваць адзін аднаго будзем не з новым шчасцем, а з новымі цэнамі. Цярплівы, аптымістычны народ).

Перад студэнтам таксама стаіць складанае пытанне: паспрабаваць далей вучыцца з такой стыпендыяй ці заняцца бізнесам, каб выжыць у цяперашнім жахлівым становішчы. Што нас чакае? Што год наступны нам рыхтуе? Пакуль вучымся. І, напэўна, вельмі хутка зразумеем, што не ўсе запаветы старэюць.

Таццяна КАЗАК.

СЛУЖБА 03

САБАКА БЫВАЕ БАДЗЯЖНАЙ

МІКРАСПАРЫЯ —заразлівая хвароба скуры, выкліканая грыбком, які вельмі ўстойлівы ў знешнім асяроддзі. У лускавінках скуры, валасах, шэрсці ён захоўваецца на працягу некалькіх гадоў.

Хварэюць мікраспарыяй хатнія жывёлы — кошкі, сабакі (асабліва бадзяжныя), ад якіх заражаюцца людзі, часцей дзеці. Заразіцца мікраспарыяй можна не толькі пры кантакце з жывёламі, але і праз прадметы, забруджаныя іх поўсцю. Асаблівую небяспеку ўяўляюць месцы пастаяннага знаходжання бяздомных жывёл: паддашкі, лесвічныя клеткі, падвалы дамоў. Пашкоджаныя грыбкамі валасы, лускавінкі трапляюць на мэблю, дываны, палавікі, а адтуль могуць лёгка апынуцца на скуры здаровага чалавека і выклікаць захворванне. У далейшым пераносчыкам інфекцыі становяцца хворы чалавек, а заражэнне можа адбыцца як праз прадметы агульнага карыстання (грабянцы, рушнікі, цацкі), так і пры непасрэдным кантакце здаровага чалавека з хворым.

У хворых мікраспарыяй жывёл прыкметы хваробы могуць быць яскрава выражаны ў выглядзе ачагоў аблысення розных памераў. Скура ў ачагах шэравата-белага колеру і пакрыта лускавінкамі. Заўважных прымет можа і не быць — калі хвароба працякае ўтоена.

Бывае, з кватэры, у жыхароў якой выяўлена мікраспарыя, выкідваюць кошку — крыніцу заражэння. Дзеці любяць і шкадуюць кінутых жывёлін. Але часам становяцца іх ахвярамі. Калі на тэрыторыю аднаго дзіцячага садочка завалачылася такое кацяня, дзеці па чарзе бралі яго на рукі, гулялі з ім, кармілі і гладзілі яго. Праз тыдзень у аднаго з хлопчыкаў, Сашы, з'явіліся на твары чырвоныя плямы, бацькоў гэта занепакоіла, яны звярнуліся да ўрача, і пасля лабараторных аналізаў было выяўлена, што хлопчык захварэў мікраспарыяй. Усяго ў гэтым дзіцячым садочку аказалася 7 хворых дзяцей.

Пры заражэнні чалавека мікраспарыяй на месцы ўкаранення грыбка праз 7—12 дзён з'яўляецца добра акрэслены ачаг ружова-чырвонага колеру, пакрыты лускавінкамі. У межах пашкоджанага ўчастка аблamваюцца і выпадаюць валасы. Аналагічныя плямы з'яўляюцца таксама на скуры грудзей, шыі, твара, рук. Хвароба распаўсюджваецца па ўсяму целу, калі своечасова не перашкодзіць гэтаму.

Дзяцей, якія захварэлі мікраспарыяй, накіроўваюць для лячэння ў спецыяльныя аддзяленні бальніц. Усе члены сям'і захварэўшага, а таксама асобы, якія знаходзіліся ў кантакце з ім, абавязкова павінны прайсці абследванне ўрача.

Каб папярэдзіць заражэнне мікраспарыяй, неабходна:

— захоўваць асабістую гігіену, сачыць за чысцінёй скуры, валасоў, ногцей;

— не карыстацца чужымі галаўнымі ўборамі, грабянцамі, рушнікамі, адзеннем;

— старанна мыць рукі з мылам пасля дагляду за жывёлай;

— забараняць дзецям гуляць з бяздомнымі кошкамі і сабакамі;

— захоўваць у чысціні паддашкі, падвалы, лесвічныя клеткі;

— пры з'яўленні прымет захворвання скуры тэрмінова звяртацца за ўрачэбнай дапамогай.

Л. ГРЫШАЛЬ,
урач 2-й гарадской клінічнай бальніцы.

Водбліск №1

Духоўная культура будуецца Намі і вамі.
Закрэпіцца ісціна свету.
Святло праніжа цемру — Сведчу.
У Духоўнага свету вароты адчынены.
Кліч. Жывая этыка.

Слова «духоўнасць» мае корань «дух».

Святло Духоўнасці — святло адносін чалавека да ўсяго, што па-за межамі яго «Я».

Давайце звернем увагу на вышэйшую праяву чалавечай культуры, таму што час сведчыць пра неабходнасць гэтага. Бо не зможам рухацца наперад. Духоўнасць фарміруе памкненні, якімі кіруецца чалавек у жыцці — значыцца, яна мае дачыненне да Лёсу. Гэта адна з тых рыс асобы, па якой мы знутрана-аўтаматычна ацэньваем чалавека, што перад намі. Акрамя ўсяго астатняга, чалавеку ўласцівыя духоўныя якасці — у кожнага свой духоўны ўзровень, які вынікае з працы чалавека па паляпшэнню ўласнай унутранай прыроды. Чуйныя людзі вызначаюць той узровень па святлу ауры над галавой. Да Духоўнасці рукой не дакранешся і ў кішэню яе не пакласці — адсюль адмаўленне. Але гэта вышэйшае паняцце засталося ў спадчыну, прайшоўшы выпрабаванне часам. Хваля гісторыі вынесла яго да нас.

Далібог, мы іграцуем высокае ў жыцці, не пускаючы туды тое святло, якое МОЖА БЫЦЬ НАШЫМ, — і лёс паварочваецца да нас цёмным бокам.

Духоўнасць кожны разумее па-свойму — гэтаму шмат прычын, якія няма сэнсу пералічваць. Лепш за ўсё паставіць Духоўнасць на пастамент і паглядзець на яе з розных кропак, рознымі вачыма. Паняцце як прамень прызмай пераломіцца ўсведамленнем — мы атрымаем каляровае шматалоссе. У ім будзем шукаць агульнае, каб знайсці своеасаблівую формулу Духоўнасці.

Вось што аб Ёй гавораць людзі.

НА МЯЖЫ ІРРЭАЛЬНАГА

Віктар Мікалаевіч БІЛАН, член Беларускага Фонду Рэрыхаў, заўзяты матэрыяліст, мяркуе:

— Чысты Дух — гэта матэрыяльная субстанцыя ў самым пяшчотным сваім стане.

Калі мы гаворым пра духоўныя вяршыні грамадства, то гэта, напэўна, індывідуальныя дасягненні духоўных настаўнікаў, да якіх грамадства можа паступова набліжацца.

Духоўны ўзровень грамадства расце разам з яго ўсведамленнем.

— Духоўнасць — абазвязковая прыналежнасць чалавечага грамадства?

— Безумоўна, калі чалавек можа ацэньваць рэчаіснасць у катэгорыях Дабра і Зла, значыцца, ён ужо валодае такім усведамленнем, якое вызначае яго духоўны бок (жывёла не можа ацэньваць жыццё ў катэгорыях, яна кіруецца інстынктам). Атрымліваецца менавіта выражэнне Духа праз усведамленне.

У Евангеліі (наскрозь духоўная літаратура) ёсць прытча пра Апошні Суд, калі Бог паставіць па правую руку ўсіх дастойных Царства Боскага за тое, што яны дапамагалі ў свой час апошняму жабраку — значыцца, зрабілі тое самае дзеля Яго, дзеля Бога. Разумееце, Хрыстос гаворыць, што дасягненне не ў абстаракцыях (маўляў, трэба маліцца ці інш.), мы павінны жыць і дапамагаць там, дзе гэта неабходна. Гэта — галоўнае, што рухае чалавека.

Або яшчэ прытча. Ідзе Хрыстос па Іудзеі ў суботу, калі ўсе павінны ўдзельнічаць у абрадах і бачыць, што чалавек арэ на полі. Хрыстос кажа яму: «Будзь благаслявёны, калі ты ведаеш, што робіш».

Трэба рабіць тое, што падказвае жыццё.

Наогул, шлях чалавека ад жывёлы да боскага стану ўсведамлення — гэта адрыў ад жывёльнага ўзроўню, дзе «працуе» закон барацьбы за існаванне, і ўзыходжанне да таго моманту, калі чалавек сабе не належыць, ён усё аддае людзям.

Мой субяседнік пераконваў, што Духоўнасць — гэта не сенсацыя, як, напрыклад, экстрасенсорыка (бо тая знаходзіцца як бы па-за жыццём), але пісаць аб ёй неабходна гэтак жа, як пра радыяцыю... Але гэта ўжо тэма наступных размоў.

АСОБНЫ АСПЕКТ ДУХОЎНАСЦІ

З пісьма Е. І. Рэрых (24.09.35. Т. 2):

«...Менавіта, трэба сцвярджаць адрозненне паміж медыумам, псіхізмам і сапраўдным духоўным развіццём.

Шмат шкоды прынеслі кнігі пра ўсялякія хатха-ёгавыя практыкаванні. Якая недасведчанасць думаць, што вышэйшага і найтанчэйшага можна дасягнуць выключна механічным шляхам. Зусім асправядліва пішаце Вы, што людзі, імкнучыся да духоўнага развіцця (прычым яны іншы раз разумеюць гэта менавіта як дасягненне псіхічных праяў) — зусім забываюцца на тое, што без дзейснага служэння агульнаму шчасцю гэта развіццё будзе аднабаковым і нетрывалым...»

Бліц-адказы: ЖУРФАК НА МУШЦЫ

Лена СПАСЮК:

— Духоўнасць — гэта, на мой погляд, здольнасць жыць не штодзённымі, дзесьці дробязнымі праблемамі, інтарэсамі, а імкненне спасцігнуць свет цэласна. Гэта жаданне справы для розуму і душы. Гэта зварот чалавека да вялікага. Акрамя таго, духоўнасць не можа існаваць без маральнасці. Думаю, што сёння існаванне духоўнасці ў нашым грамадстве наогул знаходзіцца пад пагрозай. Ёй пагражае нястрыманае «матэрыялізаванне» грамадства.

Д. А. (не выдаем з-за гуманізму):

— Уменне стаць вышэй звадак і дробязнасці гэтага свету, за яго штодзённасцю ўбачыць вечнае і сталае.

Уменне цаніць і любіць не толькі тое, што карысна і да чаго можна дакрануцца, але і «святло гаснучай зары». Наогул — чытайце «Шостае пачуццё» Гумілёва.

Ігар ДРАПУН:

— Звышстан псіхікі: вышэйшая Чалавечнасць, Дабрыня, Любоў да людзей, якая зыходзіць ад глыбокага ведання законаў эвалюцыі. Паняцце духоўнасці на штодзённым узроўні ўсведамлення часцей за ўсё звязваецца са служыцелямі культу, у лепшым выпадку — з творчымі асобамі і творамі мастацтва.

У сапраўднасці ісцінная духоўнасць — паняцце значна шырэйшае і з'ява больш родная. У гэтым сэнсе рэлігія (што літаральна значыць «аднаўленне сувязі з Духам») — практычны шлях дасягнення Духоўнасці, Мастацтва (ад слова «спакуса» ў рускай мове) — той жа шлях, тая ж духоўная практыка, толькі ў іншым аспекце. Уласнае ўражанне — гэта тое, што ні з чым нельга параўнаць, гэта пашырэнне вашага ўсведамлення да мяжы немагчымага, гэта — Палёт. Свабода як усведамленне неабходнасці таго, што ты робіш. Гэта тое, што прыцыпова невытлумачальна, але рэальна — так, як газета, якую вы зараз трымаеце ў руках.

Магу дадаць, што ў кожнага чалавека свой вопыт духоўнасці, які ў суме з астатнімі складае Духоўнасць агульначалавечую, і яна адзіная ў фундаментальных палажэннях: Вера, Надзея, Любоў, Мудрасць. Асабіста для мяне яна — Усведамленне Прыгажосці Свету. Можна скласці яшчэ дзесятак-другі вызначэнняў, але гэта не дае выйсця.

АД САТПРЭМА

ЦУД АДНАГО ЖЫЦЦЯ

Аднойчы зняверaны і беспрытульны адшчапенец з Захаду прыйшоў паглядзець на вялікага настаўніка — святую і шаноўную асобу ў Індыі. Сярод натоўпу веруючых ён на свае вочы пабачыў прыцягальнасць чагосьці невытлумачальнага, што прысутнічала ў абліччы Шры Аўрабінда — а гэта быў ён — і відавочна ўздзейнічала на натоўп.

«Гэта было як само жыццё, — Сатпрэм не мог дакладней перадаць адчутае. — Быццам на вас праз вочы зірнула Ісціна». Так пачалося для Сатпрэма знаёмства з усходняй філасофіяй — той незразумелай для еўрапейца з'явай, якая АБАВЯЗВАЕ сваіх прыхільнікаў, абраўшых шлях духоўнага пошуку, прысвяціць яму ўсё жыццё дашчэнту, адысці ад жыцця ў грамадстве, стаць амаль аскетам і жыць у ашраме, бясконца спасцігаючы нешта недасяжнае «сярэдняму розуму», набываючы звышчалавечыя якасці і здольнасці.

Сатпрэм вярнуўся да Настаўніка, і вынік таго ўчынку — цудоўная кніга не пра духоўную палеанталогію, а пра рэальныя, бадай што неверагодныя магчымасці чалавека, пра тытанічныя цяжкасці Шляху, пра выйсце з тупіка нашай цывілізацыі, нават пра тое, якім можа стаць чалавек, дасягнуўшы боскага ўзроўню.

Каардынаты кнігі ў Ленінскай бібліятэцы: 343362, Л., ЛГУ, 1989. Сатпрэм «Шры Аўрабінда або падарожжа свядомасці».

Кніга, урывак з якой мы прапануем, і ў Індыі, і на Захадзе, лічыцца класічнымі ўводзінамі ў светапогляд індыйскага мысліцеля Шры Аўрабінды Гхоша (1873—1950), які ў свой час арганізаваў нацыянальна-вызваленчы рух у Індыі, а па-за межамі рэвалюцыйнай работы пісаў паэмы, вершы плюс паэтычны эпас «Савітры», названы знаўцамі «пятай Ведай». Вялікі гуру (гэта найменне сведчыць аб вышэйшым узроўні ўсходняга філосафа) вядомы як заснавальнік інтэгральнай ёгі, з яго імем звязаны горад будучыні, які будуецца пад эгідай ЮНЕСКА і названы ў яго гонар Аўравілем.

«Падарожжа свядомасці» — не толькі захапляючае апісанне ўнікальнага эксперыменту — падарожжа ў глыбіні чалавечай псіхікі, але і запрашэнне здзейсніць уласнае даследаванне і суаднесці ўласны вопыт за тымі станамі свядомасці, якія апісаны ў кнізе.

Галоўным дасягненнем Шры Аўрабінды Сатпрэм лічыць яго спробу наблізіць новую эру ў эвалюцыі Зямлі. Аўрабінда — гэта перш за ўсё «піянер» эвалюцыі, а эвалюцыя, пераконвае Сатпрэм, не мае нічога агульнага з тым, каб рабіцца «інтэлектуальней», яе сэнс — каб станавіцца «свядомей». «Чалавек — гэта пераходная істота, — пісаў Шры Аўрабінда, — яго станаўленне не скончана... Крок ад чалавека да звышчалавека стане новым здзяйсненнем зямной эвалюцыі. Гэта непазбежна, паколькі гэта адначасова і імкненне ўнутранага Духу і логіка ўнутранага працэсу».

І тут мы ўступаем у зусім нязведаную галіну — туды, дзе пачынаецца «супраментальная ёга» Шры Аўрабінды, звязаная з лёсам усяго чалавецтва. Аўтар спрабуе даказаць, што да стану, у якім сёння знаходзіцца чалавецтва, — гэта не «зыход у нікуды», а пераходны перыяд, крызіс эвалюцыі, час нараджэння «чагосьці новага». Згушчэнне цемры, па аўтару, ёсць не што іншае як «прыкмета з'яўлення больш вялікага Святла, якому наканавана спусціцца, каб ліквідаваць існуючыя абмежаванні».

СЛОВА САТПРЭМУ:

«Стагоддзе падарожжаў і прыгод прайшло. Нават калі мы накіруемся да далёкіх галактык, апранутыя ў скафандры і ўзброеныя камп'ютэрамі, то гэта нічога не зменіць, мы выявім, што мы ўсё тыя ж: дзеці, не надта ўпэўненыя ў тым, як і навошта яны жывуць... Але чым складаней выпрабаванне, тым хутчэй мы знаходзім спосаб яго пераадолець, і аказваецца, што нялёгкі пераходны перыяд, у які мы ўцягнуты, вядзе да больш яркага святла. Такім чынам, мы стаім, як перад сцяной, перад апошнім даследаваннем, якое нам засталося, перад апошнім падарожжам і прыгодай — перад самімі сабой.

Першым этапам ў ёзе Шры Аўрабінды і галоўнай задачай, вырашэнне якой будзе ключом да шматлікіх дасягненняў, з'яўляецца ўстанаўленне маўклівасці ў розуме. Могуць запытацца, навошта трэба гэтая маўклівасць розуму? Відавочна, калі мы хочам адкрыць новую краіну ў сабе, то напачатку нам трэба пакінуць старую, і ўсё залежыць ад рашучасці, з якой мы робім гэты першы крок. Іншы раз гэта падобна на ўспышку. Нешта крычыць у нас унутры: «Хопіць гэтай балбатні!» — і мы адразу трапляем на шлях і ідзём без аглядкі. Іншыя гавораць «Так», пасля «Не» — яны вагаюцца да бясконцасці паміж двума светамі. Яшчэ раз падкрэслім, што мы не імкнемся адарваць ад сябе тое, што ў нас ужо ёсць і што дасталося нам цяжкай працай у імя Мудрасці — Міра — Прасветленасці, і пастараемся пазбягаць слоў высокіх і пустых, мы імкнемся да юнацтва — вечнага юнацтва істоты, якая вечна расце, мы імкнемся да існавання больш дасканалага, больш шырокага...

Сапраўды, калі спыняецца машына розуму, чалавек робіць рознага роду вынаходніцтвы і, перш за ўсё, ён разумее, што калі здольнасць думаць — гэта цудоўны дар, то здольнасці не думаць — дар значна больш вялікі. Хай той, хто шукае, паспрабуе не думаць хаця б на працягу некалькіх хвілін — ён хутка ўбачыць, з чым ён мае справу! Ён зразумее, што жыве ў нябачным хаосе, няспынным віхуры, запоўненым выключна яго думкамі, яго адчуваннямі, імкненнямі і рэакцыямі — «Я», заўсёды «Я» — гном-пераростак, які ўсюды ўмешваецца, усё зацямняе, бачыць і чуе толькі сябе, ведае толькі сябе (калі наогул ведае), гном, чые нязменныя тэмы ствараюць ілюзію навізны толькі дзякуючы таму, што яны ўвесь час змяняюць адна адну. «У пэўным сэнсе мы ёсць не што іншае, як складаны згустак ментальных (гэта пра сферу думкі) нервовых і фізічных звычак, якія ўтрымліваюцца разам некалькімі кіруючымі ідэямі, жаданнямі і асацыяцыямі — амальгама з многіх маленькіх самапаўтараючых сіл і некалькіх асноўных вібрацый. Да 18 гадоў мы як быццам бы сфарміраваліся, сфарміраваліся нашы галоўныя вібрацыі. А пасля вакол гэтай пачатковай структуры ўсё больш шчыльнымі слаямі, усё больш вытанчанымі бесперапынна нарошчваецца адно і тое ж — тое, што мае тысячу абліччаў і што мы называем культурай або нашым «Я». У сапраўднасці мы пасаджаны ў нейкую канструкцыю...

Мы бясконца паўтараем сябе і гудзім заўсёды адно і тое ж. Першая задача ёгі — гэта вучыцца вольна дыхаць і разбурыць, зразумела, гэтую ментальную завесу, якая прапускае толькі адзін від вібрацый, раскрыць нарэшце шматколерную бясконцасць вібрацый, убачыць свет і людзей такімі, якія яны ёсць у сапраўднасці, знайсці ўнутры ў сабе другое «Я», якое нельга ацаніць на ментальным узроўні.

Калі мы сядзім з заплюшчанымі вачыма, усталёўваем маўчанне розуму, спачатку мы бываем затопленымі думкамі. Яны з'яўляюцца адусюль, як напужаныя пацукі. Ёсць толькі адзін шлях іх сцішыць — спрабаваць выконваць гэта зноў і зноў, а галоўнае — не рабіць памылкі, не змагацца з розумам ментальна (сваімі думкамі), неабходна сканцэнтравацца на іншым. Ва ўсіх над розумам ці глыбока ўнутры ёсць імкненне — тое самае, што прывяло на шлях, нейкі пароль. Калі мы прытрымліваемся гэтага імкнення, то працаваць робіцца лягчэй. Можам скарыстаць вобраз, напрыклад, бязмежнай паверхні вады, на якой мы ляжым, становімся гэтай спакойнай бязмежнасцю.

Так мы вучымся пашырэнню свядомасці.

Чым менш укладаем напружання, тым большы поспех.

Нам патрэбна жыццё ва ўсёй паўнаце — бо мы, трапляючы ў звыклую мітусню, зноў трапляем у звыклы падзел унутранага і знешняга, жыцця знутры і жыцця мірскога, губляем ісціну нашага існавання. Нашы дзеянні не адпавядаюць нашаму ўнутранаму свету, яны працягваюць рухацца звыклым падманным шляхам. Ісціна ўнутры нас па-ранейшаму аддзелена балючым разрывам ад цёмнага механізму нашай унутранай прыроды. Таму адзінае рашэнне — практыкаваць супакаенне там, дзе гэта цяжэй за ўсё — на вуліцы, за работай... Усюды.

Замест таго, каб жыць ад аднаго разу да другога, рассеяным у мноcтве думак, якія знясільваюць, мы можам сабраць ніці ўсведамлення і працаваць кожную хвіліну.

Жыццё стане на дзіва захапляючым — мы засяроджаны, мы некуды ідзем...

Услед за гэтай засяроджанай медытацыяй можна адчуць ЗЫХОДЖАННЕ СІЛЫ...

Матэрыялы паласы падрыхтавала Наталля ЖУК.

НЕВЕРАГОДНА

ФАКТЫ,
ЯКІЯ СВЕДЧАЦЬ
ПРА ТОЕ,
ШТО І ПАСЛЯ
СМЕРЦІ
ЖЫЦЦЁ АСОБЫ
ПРАЦЯГВАЕЦЦА,
НЕСУМНЕННА
ДАТЫЧАЦЬ
КОЖНАГА
З НАС,
І ВЕЛЬМІ
БЛІЗКА.
ТЫМ НЕ МЕНШ,
БОЛЬШАСЦЬ
ЛЮДЗЕЙ
ГЭТА НАОГУЛ
НЕ ЦІКАВІЦЬ.
ЧАМУ?
ЯК
АТРЫМЛІВАЕЦЦА,
ШТО ВОСЬ ТАК
АДРАЗУ МЫ
ЗАЯЎЛЯЕМ:
«Я Ў ГЭТА
НЕ ВЕРУ»,
ПРЫЧЫМ ВЕЛЬМІ
АЎТАРЫТЭТНА?
ПРА ТОЕ,
ЯК НАБЫЦЬ
НОВУЮ СУКЕНКУ, —
ПАДУМАЕМ, ПРА
МАЛЕНЬКУЮ
СЯМЕЙНУЮ
СПРЭЧКУ
ЦІ НЕПРЫЕМНАСЦЬ
НА СЛУЖБЕ —
БУДЗЕМ
НЕПАКОІЦЦА,
А ДУМАЦЬ
ПРА СМЕРЦЬ
НЯМА НІ ЖАДАННЯ,
НІ ЧАСУ.
МНОГІМ З НАС
УВЕРАВАЦЬ
ЦЯЖКА.
МЫ
НЕ СУМНЯВАЛІСЯ,
ЗА ШТОДЗЁННЫМІ
КЛОПАТАМІ
НЕ БЫЛО ЧАСУ
ПАГЛЫБІЦЦА
Ў СЯБЕ.
І ЖЫЛІ
ЦЯЖКА.
І ЦЯПЕР
ЖЫВЕМ ЦЯЖКА,
АСАБЛІВА ТЫЯ
З НАС,
ДЛЯ КАГО
«ТАКОГА БЫЦЬ
НЕ МОЖА».

ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ ЖЫЦЦЯ

Чалавечае мысленне вельмі кансерватыўнае і больш лянотнае, чым мы звычайна лічым. Аўтар «Мастацтва мыслення» А. Дзімнэ сцвярджае, што толькі адзін чалавек з дзесяці здольны на адцягнутае мысленне. Большасць людзей жывуць з дня ў дзень кожнадзённымі клопатамі — як быць сытымі, як пракарміць сям'ю. Думаюць яшчэ пра гульбішчы і, калі застаецца вольны час, пра тое, як правесці яго. Такім чынам, да тае пары, калі прыйдзе смерць, і думаць будзе позна.

Адкрыцці Каперніка і Ньютана паказалі, што Зямля не стаіць на месцы, а «вандруе» вакол Сонца. Аднак да большасці жыхароў нашай планеты гэтыя веды ішлі вельмі доўга. Людзі, у тым ліку і вучоныя-астраномы, запэўніваліся на ўласныя вочы, што рухаецца вакол Зямлі Сонца.

Новае часта падаецца дзіўным і непраўдападобным. Англійская прымаўка сцвярджае: «Людзі вераць у тое, чаго жадаюць».

Што ж такое смерць?

Оксфардскі акадэмічны слоўнік дае зусім незмястоўнае вызначэнне: «Смерць — гэта канец жыцця».

Брытанская энцыклапедыя 1986 года: «Поўнае спыненне жыццёвых працэсаў».

Медыцынскія дапаможнікі: «Адсутнасць прыкмет жыцця: ці «адсутнасць мазгавой актыўнасці, якая пацвярджаецца электраэнцэфалаграмай».

22-гі Сусветны медыцынскі кангрэс 1968 года, які спецыяльна вывучаў праблему смерці: «Незваротная страта функцый усяго арганізму».

Гаворачы пра смерць, ужываюць і іншыя словы: «нішто», «небыццё».

Адсутнасць навуковага вызначэння смерці адзначаюць вучоныя, якія займаюцца гэтым феноменам. Не дзіўна, што многія з іх раюць замест слова «смерць» ужываць «пераход», бо цяпер вядома, што асоба працягвае існаваць. Смерць — пераход асобы ці душы з аднаго стану ў другі, са свету матэрыяльнага ў свет духоўны.

Сам момант смерці цела — тое, чаго мы больш за ўсё баімся, — неадчувальны. І калі ўсё ж усім розумам і сэрцам мы адчуем, што смерць не наш вораг, а частка жыццёвага працэсу, шукаць адказ на пытанне будзе лягчэй.

Поўнасцю пазбавіцца боязі смерці мы ніколі не зможам, таму што боязь гэтая патрэбна. Жыццё даецца чалавеку для таго, каб ён паспеў нешта зрабіць, страх смерці прымушае яго берагчы сваё жыццё. Людзі, якія пражылі свой тэрмін у працы, з карыс-цю для іншых, часта адчувалі, што яны сваю справу на зямлі ўжо зрабілі, і калі надыходзіў іх час, боязі смерці ў іх не было.

Жыццё — каштоўны падарунак, і каб яго захаваць, нам разам з жыццём дадзена і боязь смерці. Гэта натуральна. Але дрэнна, калі гэтая боязь мацней, чым яна таго заслугоўвае.

Большасць сучасных людзей — мужчын і жанчын — да тае пары, пакуль яны здаровыя і жывуць у дастатку, пра смерць не думаюць.

Акрамя таго, усё наша грамадскае жыццё пабудавана так, каб смерці не бачыць.

Цяжка захварэў нехта з блізкіх. Раней лячылі дома. Заходзіў доктар, даглядалі маці, жонка, муж. Цяпер — бальніца. Калі ён ці яна паміраюць, побач звычайна, і тое не заўсёды, медсястра ці санітарка, але не муж, жонка, дзеці, якія смерці баяцца. Калі памёр, цела памёршага ў хаце не ляжыць, родныя яго не бачаць, з ім не развітваюцца. Затым — кароткая царкоўная служба, а часта абыходзяцца і без яе, некалькі добрых слоў, калі патрабуецца асаблівая пашана — жалобны марш і хуткае пахаванне ці крэмацыя. І на могілкі потым наведваюцца ўсё радзей, ды і могілкі робяцца ўсё больш няўтульнымі, голымі.

Сучасная цывілізацыя накіравана на адмаўленне смерці.

Не думаючы, безумоўна, прасцей. Але калі смерць аказваецца блізкай і непазбежнай — захварэў чалавек ракам — сустракаць яе асабліва цяжка. Да сімптомаў хваробы дадаецца цяжкі псіхічны стан — боязь смерці, боязь невядомасці. Пагроза аказалася нечаканай. Чалавек не падрыхтаваны, ён нічога не ведае, і пачынаецца самы цяжкі перыяд чалавечага жыцця.

Што ж рабіць? Ці ў стане мы чым-небудзь дапамагчы? Ёсць, зразумела, супакойваючыя лекі, але іх уздзеянне часовае, яны нічога не змяняюць, а даюць толькі забыцца, пасля якога на сэрцы яшчэ цяжэй. Часам патрэбны і лекі, але ці нельга проста пачалавечы? Раней імкнуліся на дапамогу прапаведнікі.

Некалькі гадоў назад знайшліся і ўрачы, якія сур'ёзна заняліся гэтым пытаннем. Адным з піянераў была доктар Елізавета Кюлер-Рос. Яна стварыла сваю школу ў той галіне навукі, якая вывучае смерць.

Перш за ўсё патрэбна было даведацца, што так моцна непакоіць хворага, чаго ён баіцца, чаго яму не хапае, чаго ён хацеў бы. Даведацца можна толькі з гутаркі з цяжкімі хворымі. Але ці пажадаюць яны ісці на шчырую размову? Хутчэй за ўсё, адвернуцца да сцяны тварам.

Доктар Кюблер-Рос знайшла вельмі простыя і сумленны метад. Яна гаварыла хвораму, што вядуцца навуковыя даследванні на тэму смерці, каб дапамагчы цяжкахворым, і што для гэтага патрэбна дапамога самих хворых, каб яны расказалі, што адчуваюць, пра што думаюць. Яна прасіла дапамагчы. Зразумела, выбіраліся толькі хворыя, якія ўжо ведалі пра характар сваёй хваробы.

Амаль заўсёды, убачыўшы, што гэта не проста цікаўнасць, хворыя хутка пачыналі гаварыць. Яны радаваліся, што і ў сваім безнадзейным становішчы могуць быць карыснымі для іншых.

Паміраючы знаходзіцца ў стане эмацыянальнай адзіноты, яму цяжка. Ён пакінуты. Вакол яго — змова маўчання. Нават самыя блізкія людзі гавораць з ім пра розныя дробязі, а не пра тое, што турбуе іх. Хворы мае патрэбу ў шчырых размовах, яму не абыйсціся без адкрытага спачування.

Усё гэта нялёгка, але магчыма.

Цяжкая хвароба можа змяніць характар чалавека. Людзі становяцца больш добрымі. Яны шкадуюць аб страчаных магчымасцях зрабіць нешта добрае, аб зле, якое нанеслі калі-небудзь іншым.

Такія змены зразумелыя. Цяжкая хвароба прымушае перагледзець свае адносіны да блізкіх людзей, да планаў на будучае, да ўсяго таго, чым да гэтае пары поўнілася жыццё. Пачуццё, што смерць не за гарамі, робіць усё знешняе нецікавым. Думкі звяртаюцца да сябе. Прыходзіць жаданне ўсвядоміць сэнс жыцця і смерці. Прыходзяць думкі аб Богеі душы. Набліжаючыся да смерці, многія людзі «растуць».

Урачоў, якія займаюцца цяжкахворымі, гэты рост за некалькі дзён да смерці спачатку здзіўляе, але быў ён настолькі відавочным, гэты інтэлектуальны і духоўны рост. Кюблер-Рос піша, што набліжэнне смерці вызваляе наша сапраўднае «Я» ад умоўнасцей, калі мы жывём чужымі думкамі і загадамі. Рост у тым, што мы ўжо не адлюстроўваем чыёсьці, а робімся ўсё больш самі сабой, што мы адкідваем ланцугі прымусу, апранутыя на нас грамадствам, і жывём больш вольна.

Сэнс жыцця ў росце, у развіцці, і не толькі тут на зямлі. Душа чалавека, якая перайшла ў замагільны свет, атрымлівае магчымасць далейшага развіцця і там. А імкнучыся адмаўляць гэта да канца, мы робім апошнюю частку нашага жыцця і бессэнсоўнай, і вельмі цяжкай.

У чалавека, які зразумеў, што надыходзіць канец яго зямнога жыцця, ёсць толькі дзве магчымасці — чакаць смерці ці выкарыстоўваць поўнасцю час, які застаўся. Гэта, зразумела, адносіцца не толькі да хворых, але і да здаровых, бо ўсіх нас кожны дзень набліжае да смерці.

MEMENTO MORI

Думаючы пра смерць, мы часцей за ўсё ўяўляем сабе паміранне як нейкі кароткі момант, імгненне. Да гэтага моманту чалавек жыў, а цяпер — толькі мёртвае цела. Зразумела, смерць можа быць і імгненнай, як, напрыклад, у час выбуху снарада, які разрывае цела на часткі. Аднак пры натуральнай смерці гэта зусім не так.

Але ж цела, як вядома, састаіць з клетак і тканак, і пры паміранні чалавека смерць розных тканак адбываецца не ў адзін і той жа час. Пасля смерці клетак галаўнога мозга клеткі некаторых іншых тканак, больш прымітыўных, будуць яшчэ некаторы час жыць і нават размнажацца. Гэта і дазваляе хірургам рабіць усё больш частыя ў апошні час перасадкі органаў ад мёртвага жывому. Таму з пункту гледжання біёлага, нельга гаварыць аб нейкім адначасовым паміранні ўсяго арганізма.

Нас, аднак, цікавіць не паміранне асобных тканак, а паміранне ўсяго арганізма.

Смерць мае не толькі знешнія, але і ўнутраныя прычыны. У фізічнай смерці ёсць часта ўнутраная псіхалагічная прычына. Людзі паміралі ад спуду, вялікай бяды і нават пры нечакана вялікай радасці. Пішуць, што смерць можа быць вынікам унутранага ўнушэння, пасланага ворагам, аб якім памёршы нават не ведаў. Прычына смерці можа быць зусім трывіяльнай і незразумелай. Смерць надыходзіць, здараецца, у момант любога дробязнага, але вострага адчування, якое звязана з асцярогай ці чаканнем непрыемнага.

Душа можа пакідаць цела не толькі перад смерцю. Шырока вядомыя астральныя палёты ёгаў. Гэта можа дасягацца штучнымі прыёмамі ці адбывацца само па сабе пры стоме, стрэсе, у сне. Такія выпадкі нярэдкія.

Цэлія Грын, дырэктар псіхалагічных даследванняў у Оксфардзе, на свой запыт атрымала 400 станоўчых адказаў. Успрыманні былі падобныя на тыя, што назіраліся пры паміранні — пачуцці захоўваліся, сляпыя бачылі, і памяць аб тым, што адбывалася, заставалася.

Аб існаванні «механізма» які служыць для адключэння душы ад цела, піша доктар Сабом і іншыя вучоныя.

Існаванне такога фізіялагічнага фактару здаецца несумненным. Як іначай растлумачыць смерць у той жа момант пры бурнай радасці, перапудзе, нечаканую смерць ад якой-небудзь нікчэмнай прычыны. Ёсць, выходзіць, нейкі псіхалагічны механізм, уключэнне якога вядзе да выхаду душы з цела і да спынення жыццёвых функцый. Гэты фактар, існуючы ў лацэнтным стане ад нараджэння, актывізуецца нейкім псіхалагічным уздзеяннем.

Смерць, а таксама і жыццё, якімі мы іх ведаем на зямлі, могуць падацца бессэнсоўнымі. Нарадзілася дзіця, яго выхоўвалі, вучылі, а яно памірае, не паспеўшы нічога зрабіць у жыцці. Нявеста памірае адразу пасля вянца. Салдат, які ідзе дадому з вайны, можа загінуць, трапіўшы пад аўтамабіль. Сэнс можа быць толькі ў тым выпадку, калі смерць цела не канец існавання асобы.

Жыццё чалавека на зямлі патрэбна толькі для фарміравання духу, пошукаў таго шляху, па якім душа пойдзе ў жыцці вечным. Гэта дае адказ на ўсе нашы неўразуменні і растлумачвае раннюю смерць праведнікаў, доўгае жыццё дрэнных людзей (якім, значыць, гасподзь дае час зразумець і змяніць свой шлях) і ўсе тыя смерці, якія падаюцца нам бессэнсоўнымі і непатрэбнымі.

У смерці ёсць свае ўнутраныя прычыны, знешнія фактары — хваробы і няшчасныя выпадкі — вядуць да смерці чалавека тады, калі далейшае зямное існаванне ўжо не мае сэнсу для жыцця душы.

Прадбачанне смерці нам не дадзена, але прадчуванне яе бывае нярэдка.

Прадчуванне — не боязь смерці, у нейкай ступені яны нават супрацьпастаўляюцца адно аднаму. Боязь смерці бывае часцей за ўсё ў людзей, для якіх смерць азначае страту ўсяго, што яны любяць. Яны яе баяцца — не хочуць, прадчуванне смерці ў іх бывае вельмі рэдка.

Чалавек праведнага жыцця часта прадчувае сваю хуткую смерць. Ён не баіцца, проста спакойна чакае. Пасля натуральнага жыцця ён і смерць успрымае як нешта натуральнае і нармальнае. Відавочна, гэта падобна на тое, як чалавеку, які стаміўся ад дзённай працы, хочацца заснуць. Яго смерць і будзе мірнай і лёгкай, як засыпанне.

Навука аб смерці — маладая навука, але яна ўжо прынесла ў свет новае разуменне працэсу паміранння і самой смерці.

Чалавек мае душу і цела. Душа мае патрэбу ў целе для яе дзейнасці ў матэрыяльным свеце, але не для жыцця; душа можа быць і без цела. Акрамя знаёмага нам матэрыяльнага свету, існуе іншая рэальнасць, якую мы, жывучы на зямлі, не спасцігаем. Успаміны памёршых на час падказваюць нам, што смерць не аддзяляе «той» і гэты свет непраходнай сцяной. У гэтай сцяне ёсць дзверы, якія зачынены не зусім наглуха. Смерць — толькі пераход з аднаго свету ў другі.

Спазнаўшы, што жыццё працягваецца і за труной, людзі ўжо не баяліся смерці. Знікалі дробязныя трывогі, жыццё рабілася больш сур'ёзным і духоўным.

Новае святло, якое ўваходзіць у наша жыццё, робіць людзей лепшымі.

Доктар Кюблер-Рос, ацэньваючы апошнія навуковыя адкрыцці, піша, што цяпер адбываецца адраджэнне ідэй у сэнсе жыцця і смерці: «Я лічу, што мы падыходзім да новай эры у жыцці чалавечага грамадства».

Фота С. ГРЫЦА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

14 лістапада
Зак. 2078.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.